Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Год трэци. Вильня 22 мая 1908 г. № 11.

Цэна з перэсылкою и дастаукою да хаты: на 1 г.— 3 р., на 6 мес.— 1 р. 50 кап., на 3 м.—75 к., на 1 мес.—25 к. Без дастаукн и перэсылкн: на 1 г.— 2 р. 40 к., на 6 м.— 1 р. 20 к., на 3 мес.—60 к., на 1 мес.—20 к. За границаю: на 1 г.— 4 р., на 6 мес.— 2 р., на 3 мес.— 1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

# Наша Нива

Першая Беларуская Газэта з Рысункамі

Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами

Падписка прынимаецца и прадаюцца атдзельные: нумэры газэты 1) У Кант. „Нашай Нивы“ — Виленская вулица дом № 20, 2) У Книгарни „Знание“ — Георгиески проспэкт дом № 4 3) У Книгарни Литоуской М. Пясэцкой — Шлапэлис, Доминиканская вулица дом № 13.

Адрэс рэдакцiи и администрацiи: **Вильня, Виленская вулица, дом № 20.**

Абъяулення прынимаюцца на наследней страницы на 20 кап. за линейку малыми литэрами. Рукописы и корэспондэнции, прысланные у рэдакцию, мусяць быць чытатэльна написаны з праудзивою фамильею и адрэсом таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падписаць прозвищэ разом з фамильею, хто незахочэ, каб была надрукована праудзивая фамилия. Адрэс и фамилия тольки для ведама рэдакции.

Рэдакция и кантора «Нашае Нивы» пераехала на новую кватэру на *Виленскую вулицу дом № 20* (рог Новай вул.).

## У Думе и каля Думы.

—o—

*63-яе заседаньне.* Абсуждали расходы на министэрства гандлю и фабрык. Зацьвярдзили расходы на канцылярыю министэрства финансоў.

* * *

*64-ае заседаньне.* Циха и спакойне Дума зацьвярдзила гроны на марские порты (гдзе заходзяць карабли). Цикава тольки тое, што начальства ў кожным порци надта многа— напрыклад у Рэвлю на инжэнероў выдаецца 26 тысячоў, а на работы, каторые яны робяць,—18 тыс. руб. Зацьвярдзили грошы ешчэ на пограничную стражу, на акцызнае „ведамства“ и манапольку.

* * *

На *65-ым заседаньни* абсуждали финлядзки „запрос“. *Марков II* (правы, памешчык з Курска), гаварыў, што трэба ад Финляндии адабраць усе правы и их самаупраўленьне („аўтономию“). *Милюков* (ка-дэт) давёў, што и правые, и прадседацель министроў Столыпин мыляцца, кажучы, што Финляндию трэба циснуць; кали Финляндия прылучалася ад Швэции да Расеи, тагды руски Цар зацьвярдзиў и падписаў ўсе правы, каторые цяпер маюць финляндцы.

*66-ае заседаньне.* Акцябрыст *Петрово-Соловово* заявиў, што ён пра Финляндию думае тое самае, што и Милюков. Запрос аб Финляндии „правых“ Дума адкинула.

* * *

*67-ае заседаньне.* Зацьвярдзили расходы на дэпартамэнт лесоў. Дэпутат *Некрасов* (ка-дэт, прафэсор, ад Томскай губ.) расказаў Думе аб непарадках на „васточно-китайской“ жалезнай дарози и аб тым, што там трэба завясьци кантроль.

* * *

*68-заседаньне.* Дэпутат *Косоротов* (социал-дэмократ, мужык уфимскай губ.), пасля выбара яго дэпутатам, на станции гаварыў да народу. За гэту мову яго следавацель винавациць ца 129 ст., бо ён гаварыў проци правицельства.

Министэр „юстиции“ (судоў) трэбуе выдалиць яго з Думы, каб суд яго судзиў. Але дэпутата можэ выдалиць тольки сама Дума, дык вось Дума и мяркавала, ци выкинуць яго, ци не. Министэр „юстиции“, правые дэпутаты, Замыслоўски (ад Виленск. губ.) казали, што стражнику, каторы быў на станции и слухаў мову Косоротова, трэба верыць. Левые казали, што ня можна ве-

рыць, а Косоротова трэба аставиць дэпутатам.

* * *

Разглядаючы расходы гасударственые Дума паменьшыла их на 50 мильёноў руб.

* * *

Кольки мужыкоў дэпутатоў заявили праваслаўным папом, што як будзе разбираца ў Думе закон аб тым, каб даваць што год 4 мил. руб. на пэнсии гарадзким и сельским папом, то яны, мужыки, будуць даваць галасы процiў.—За тое папы-дэпутаты пастанавили прасиць у Думы гэтые 4 мил. руб., кажучы, што народ бедзен и ня хочэ плациць папам; вось нехай пэнсии им даюць казна и земства.

## Дэпутаты Першай Гас. Думы у турме.

(З газэты „Рѣчь“).

—о—

Як ведама, дэпутатоў Першае Думы, каторые написали **„выборгскае воззваньне“** к народу пасьля роспуска Думы, асудзили ў турму на тры месяцы. Многа с-памеж их ужо пачали адбываць гэту кару.

8-га мая ў **Пецербургу** сабралися ў судзе тые дэпутаты, што цяпер жывуць у сталицы. Тут аказалося их 17 чал. У судзе чакали их крэўные, прыяцели, знаёмые и грамада народу.

Аказалося, што и ў турму без паспорта не пушчаюць. Вось адзин з дэпутатоў, Петрункевич, каторы не ўзяў з сабой паспорта, мусиў ехаць па яго да дому.

Сэкрэтар пракурора записаў прозвишча ўсих, хто прышоў адбываць кару. Тады написали бумагу и паслали ў турму, а дэпутатом сказали исьци туды самым, без канвою.

Па дарозе ў турму дэпутатоў витаў народ. Многа людзей чакала их пры самай турме, што завецца „Крэсты“.

Як жывецца им ў тых „Крэстах“, аписываюць газэты. Дэпутатоў трымаюць саўсим так сама, як звычайных угалоўных арэштантоў. Завяли нават новы парадак: забаранили прынасиць арэштованым яду ў турму, апроч тольки цукру и гарбаты. Дый усё жыцьцё их вельми цяжкое, але-ж дэпутаты не жаляцца, трымаюцца добра ды ў листах да жонак сваих нават падсьмеиваюцца з усяго.

---

Ў **Маскве** дэпутаты пачали сваю „адседку“ ў турме „Каменшчыки“ 15 мая. Тут их усяго 12 чалавек.

Каля 1-ай гадзины ў дзень, ня гледзячы на вялизную гарачыню, пачаў збирацца народ, каб прывитаць сваих даўнейшых выбарных людзей. Было тут многа кабет, паненак з кветами для дэпутатоў. Стали прыежджаць и дэпутаты пад канвоем акалотачных надзирацелёў. Між дэпутатами видаць и быўшаго таварыша министра ўнутрэных дзел—князя Урусова. Дэпутатом даюць кветки, шчыра витаюць. Ў канцы падъежджае прадседацель Першае Думы — Муромцэў; ён нават без канвоя.

Як тольки сабраўшыся народ убачыў яго, пачалися крыки: „Ура!“ „Нехай жыве прадседацель Першай Думы!“ „Ура прадседацелю!“ „Ура Першай Думе!“—Муромцэва закидали кветами з усих старон; ён цалаваўся з многими с-памеж народу; неяки пан, як Муромцэв ўхадзиў ужо ў турму, схапиў яго за руку и пацалаваў. .

Так аписвае „Рѣчь“ прывитаньне дэпутатоў ў Маскве. Як и ў Пецербургу, жывецца им ў турме ня надта смачна.

## ТРЫ ДАРОГИ.

(Пераложэна с польскаго—М. Конопницкай).

Идуць тры сьцежки с хаты
На долю и нядолю:
Идзе адна, гдзе пану
Людцы пахаюць поле;
На лева ад хацины
Идзе ў карчму другая,
А трэцяя— к магилкам,
Гдзе брат наш спачывае....
Ад цяжкай працы, поту
Адна расицай свециць;
Хто па другой праходзиць,
— З бацькоў сьмяюцца дзеци;
Палын расьце на трэцей,
И наспы выжэй, нижэй,
И плачэ там бярозка,
И крыж стаиць на крыжу....
Па сьцежках гэтых ходзяць
У лапцях нашы людзи.
Гэй! хто им сьцежку ўскажэ,
Што весьци к шчасьцю будзе?..

Янук Купала.

## Аб земским самоупрауленьни у Беларуси.

—::::—

Адна вёска М-ка Вилейскаго павету, ў каторай личыцца 126 дзес. ападаткованай зямли, плациць ў 1907 году 7 руб. 41 кап. гасударственаго налога, 52 р. 96 к. „мирских“ и 12 р. 74 кап. *губэрнскаго земскаго сбору (падатку);* мястэчка Р-чы, што недалёка, плациць за сваю зямлю (думскую) 49 р. 95 кап.; з усяе виленскай губ. з зямель памешчыкоў, мужыкоў и гарадоў збираецца такога земскаго падатку 556 тысяч руб., ды кожны, хто мае дом па гарадох, так сама

плациць той земски падатак — з усих гарадоў и мястэчэк, Виленск. губ. набираецца 111 тысячоў руб.; с казёных зямель и лясоў—112 тысяч, ды ешчэ з фабрык, гандлю, з судзебных спраў збираецца 155 тыс. руб. —Кали ўсё гэта злажыць разам, то земскага падатку бяруць з Виленск. губ. 935 тыс. руб. Ў кожным рублю гэтых 935 тыс. руб. ёсць $59\frac{1}{2}$ кап.—з зямли, трохи менш як 12 кап.—з гарадоў и мястэчэк и 12 кап. с казёных лясоў и зямель, а з фабрык и других—каля 17 кап.

Ў 33 губ. вяликаруских распаражаюцца гэтыми грашми губэрнские и вуездные земские сабраньня (сходы), каторые саладаюцца з выбарных („гласных“) ад памешчыкоў, мужыкоў, мястэчэк. У Виленскай, Гродзенскай, Ковенскай и ешчэ ў 5 губэрнях Расеи земскай гаспадаркой займаюцца „Губэрнские Распарадзицельные Камитэты“, злożжэные с чыноўникоў, каторых назначае правицельства.

Земские грошы выдаюцца ў Вилен. г. гэтак: ў дарожны капитал—168 тысячоў, на утрыманьне тутэйшаго правицельствен. („гражданскаго“) упраўленьня — 196 тысяч; на народнае здароўе (бальницы, дахтары, фэльчэрские школы) — 127 тыс. руб.; на багадзельни, прыюты и уселякую помач для бедных, хворых—210 тысяч руб.; на вэтэрынарные справы—16 тыс.; на турмы для малалетних арыштантаў—17 тыс. р.; на кватэры воинским прысуцтвам—15 тыс.; на праваслаўных духоўных — 75 т. руб. (—ў нашым краю па вёсках праваслаўные духоўные дастаюць пэнсию з земских грошэй, а па гарадох—ад казны); на земскую стайню —$6\frac{1}{2}$ тыс. р.; на цэркоўна-прыходзкие школы—$37\frac{1}{2}$ тыс. р.; на казённые—32 тыс. 355 руб.; на розные патрэбы школ—8.280 р.; на прыют В. И. М. Ф. 2000 руб. и ў запасны капитал—$27\frac{1}{2}$ тыс. р.

Не разбираючы ўсих гэтых расходоў, скажэм, што на народную асьвету даецца на сьмех мала грошы—тольки 8 працэнтоў, —значыць, с кожнаго рубля, што збираецца на земства, тольки 8 кап. идзе на вучылишча, дый то тольки пачынаючы гэтым годам, а за 1905, 6 и 7 год на школы давали менш як 5 кап. з рубля. А тым часам ў Масковским земстве ўжо ў 1871 году—37 лет таму назад давалося 10 кап. з рубля на народную асьвету, а цяпер куды больш. У Виленскай губ. праз усё гэта и вучылишч менш адкрываецца, як у других губэрнях. У Минскай губ., гдзе недаўна увяли земства, хоць и чыноўницкае, земства дае грошы на домы для школ и на книги, и там адкрываецца ў 1908 году новых 140 школ, а ў Виленскай губ.—тольки 78. Бадай усе мястэчки ў Виленшчыне просяць адкрыць ў их Гарадзкие Вучылишча, але ад их трэбуюць грошы на кватэру рублёў 500 ў год; мястэчки ня маюць гэтых грошы... На новые народные шко-

## „Асадзи назад!“

Дрэнна маё жыцьце:
Усё идзе не ў лад,
И крычаць усюды:
„Асадзи назад!“

Божэ ты мой милы!
Бьюся я, як гад;
Тольки-ж куды выйду —
„Асадзи назад!“

Помню, я жаниўся —
Добры быў мой сват!
К дзеўцы нос паткнули —
„Асадзи назад!“

Дзеўка была важна.
Багатыр Кандрат
Ногу мне падставиў, —
„Асадзиў назад!“

Трапиў я у горад,
Быў як раз „парад“.
Лезу я уперад —
„Асадзи назад!“

Пуста у засеках,
Жыта пабиў град....
— Дай, старшынка, ссуды!
— „Асадзи назад!“

Я с капейки зьбиўся,
Зарабиць я рад.
— Ци нима работы?
— „Асадзи назад!“

Сам я растрапаўся,
Лезе с плеч халат...
— Памажэце, людзи!
— „Асадзи назад!“

Ў вёску хлеб прыслали, —
Там галодных шмат....
Пруся я з мяшэчкам....
— „Асадзи назад!“

Сына свайго ў людзи
Вывёў бы Игнат.
— Ось мой сын, паночки!
— „Асадзи назад!“

Галаву я маю,
Быў-бы дэпутат...,
— „Правоў ты ня маеш —
„Асадзи назад!“

Праўды, што таицца?
Быў и мой чарод:
Адзин раз на жыцьцю
Вышаў я ў пярод!

Ўзбунтавалась вёска —
Ой, быў цяжки год! —
Прыежджае прыстаў:
— „Выхадзи ўпярод!“

. . . . . .

**Тамаш Булава.**

лы трэбуюць з воласьци грошы: воласць не дае, дык так и астаецца бяз школы. Тое самае робицца и ў Гродзенскай губ. Вось с тых 600 тысяч руб., што цяшер Дума адпусьцила на Виленски Учэбны Округ (Нар. Обр. въ Вил. Учеб. Округѣ № 3, 1908), на Виленск., Ковенск. и Гродзенск. губэрни выпадзе найменш, бо тут нима ниякаго земства.

На нямач сельскай гаспадарцы ў Виленскай губ. не даецца ни адпэй капейки. Тым часам ў 33 земствах ў Расеи шмат для гэтаго робицца. Напрыклад, самае багатае и лепшае земства ў Маскоўскай губэрни — выдала (1889-93 г.) на паляпшэньне гаспадарки, хатняго рэмесла, на учоных агранамоў (што абучаюць мужыкоў, як лепш гаспадарыць), на лепшую скацину, паказные паля, на книги аб гаспадарцы, на сельские банки — ўсяго 358 тысяч руб.; Смаленскае земства (у Смаленск. губ. жыве шмат беларусоў) выдала 49 тыс. р., Чэрнигоўскае — 597 тыс. руб.

Земскае самаупраўленьне ци, як кажуць, „земства“ ў 33 губэрнях Расеи уведзена ў 1865 гаду; спачатку яно мела больш правоў але потым шмат правоў адабрали, и найменш галасоў маюць там мужыки. Але ўсё-ж таки, кали прыраўнаваць гэтые земства да земских спраў ў Беларуси, то гэта як неба и земля, бо ў нас грашми распараджаюцца не выбарные людзи, а чыноўники. И наш край так змарнеў, бо ня мае земскаго самоупраўленьня.

„Окраинный союз“ (правы), у Вильне и Минску, каторы выбраў ў Думу Замыслоўскаго и Шмида, заяўляе, што тут ня можна ўвадзиць земства, бо у беларуским краю маюць силу польские памешчыки, и меж ими толькі ёсць людзи з навукай, так што земства пападзе ў их руки; вось гэты „саюз“ хочэ, каб саўсим тут не было земства, а кали даваць яе, дык даць такое, што им киравали бы толькі руские людзи,—значыць, чыноўники, бо руских памешчыкоў у нас мала, а изноў вучоных беларусоў мала. Скажэм мы „саюзником“ на гэта, што беларуски мужык на усих гэтых сварках кепска выйдзе. Як у адной байцы: дрозд сеў на бабу, а дзед хацеў забиць дрозда, ды так ўрэзаў цэпам па дразду, што забиў не дразда, а бабу. Беларуским мужыком будзе лепш ўсяго, каб ў земским самоупраўленьни, кали яно ўвядзецца, мужыки мели найбольш галасоў и силы, бо мужыкоў ў нас больш за ўсих. Тагды яны патрапяць выбраць ў земства и з руских, и з палякоў, и з сваих беларусоў добрых людзей, каторые шчыра будуць працаваць, каб падняць культуру и багацтва народу и завясьци добрые парадки. Таких людзей можна знайсьци у нас, нехай толькі „Окраинные саюзы“ и др. не сами выбираюць, хто лепшые апекуны мужыком —руские, ци паляки, а дадуць мужыком волю самым выбраць, хто им падабаецца.

Другим разам апишэм, якое устройства земскаго самоупраўленьня для нас найлепшае.

**А. Ў**

# ДОЛЯ БАТРАЧКИ.

Маци ў службу выпраўляе
Родную дзяцину
И украдкам выцирае
Горкую сьлязину.
— „Будзь паслушна ты, дачушка“, —
Навучае матка: —
„Дагаджай чужым ты, служка,
Ды цярпи, дзицятка!
Не адзин раз твае вочки
Заплывуць сьлязою;
Твая доля цямней ночки, —
Цяжка быць слугою!
Не уважыць чужаница
Ручэк тваих белых;
Поту выльецца крыница
З шчочэк загарэлых.

Леткам ўстанеш раней зорки,
Перша пойдзеш ў поле....
Ох, дачушка, хлеб твой горки,
Горка твая доля!“ —
Маци дочку разважае,
Сябе цешыць стара;
Жаль ей к сэрцу падступае,
Як бы тая хмара. —
Вось дзяўчына ўжо гатова,
Пакидае хатку.
— „Ну, матулька, будзь здарова!“
И цалуе матку.
Вышла маци ў след за ёю,
Стала пры парогу
И, падпёршы твар рукою,
Глядзиць на дарогу.

Доўга матка ўсё глядзела,
Доўга паглядала, —
Поки Ганны хустка бела
З вачэй не прапала....

Якуб Колас.

# З Беларуси и Литвы.

(Ад нашых карэспандэнтоў).

**Вильня.** Нядаўно тутака тры салдаты разам з кухаркай и пакаёўкай генэрала Быкоўскаго, згаварыўшыся меж сабою, забили гэтаго генэрала ды прыдушыли жонку яго и аграбили у их грошы. Их злавили ўсих пяцёх, и ваенны суд прысудзиў их павесиць. Аднэй кабеце — Лаушкиной (жонцы аднаго з трох салдатоў) генэрал-губэрнатор сьмертную кару замяниў катаргой; другую — Скляренко павесили ў пяток, а трох салдатоў — ў суботу ў ночы. Пры вешаньню салдатоў была цэлая рота и трохи народу. Прысуджэные на сьмерць гаварыли мовы к народу и к сваим таварышам-салдатом. Лаушкин сказаў: „Браты, жывеце справедливе, сумеиьне, ганице вон ад сябе ўсе злые пакусы. Гэта гавару вам я — праступник, прыгаворэны на сьмерць". Тое-ж гаварыли и два другие — Ляцын и Малинин.

З. **м. Рукойни** Виленск. губ. и п. Ў Рукойнях мужыки найбольш каталики; некали яны хацели, каб цэркву аддали на касьцёл. Яны адабрали ключ ад гэтай цэркви. За гэта быў суд, и цэркви им не дали. Дык вот яны хочуць цяпер збудаваць новы касьцёл, але некаторые кажуць, бытцам старшына и писар не прыхильны да гэтаго.

Недаўна скончыўся тэрмин старому старшыне. Хаця ён и хацеў астацца и стараўся аб гэтым моцна, але мужыки яго скинули и выбрали новаго. Новаму старшыне мужыки верыли, але стары старшына не дрэмаў, и земски скинуў новаго; вось стары старшына изноў зачапиў медаль на грудзи. На новаго старшыну яго непрыяцели напляли, бытцам ён бунтаўшчук и намаўляў некали мужыкоў адбираць ключ ад цэркви, ды што ён социалист и др. Мужыки ня ведаюць, як им зрабиць, каб мець добраго для сябе старшыну. **И. Свой.**

Гор. **Вилейка,** Виленск. губ У прошлым тыдни неякая кабета палезла ў яму, гдзе у яе была бульба, и пачала набираць тую бульбу ў кошык, каб яе пасадзиць у сваим гародчыку. Покуль кабета сядзела на дне ямы, раптам земля з бакоў абсыпалась и пахавала пад сабой гэту кабецину. Як яе адкапали, яна ўжо была нежывая.

**Вилейски.**

г. **Радашковичы** Вилен. г. Вилейск. нав. У нас некаторые „прагрэсиўные" людзи ўсё збираюцца адкрыць гарадзкую библиотэку, с каторай бы выдавали книжки руские, польские и др. за невяликую плату ўсим. Книжки будуць и для интэлигенции, и для простаго чалавека. — Трэба, каб гарадзкая Дума падала прашэньне губэрнатару аб библиотэцы. Горад Радашковичы мае 4 тыс. жыцелёў и гарадзкое вучылишчэ, ды кругом шмат вёсак и народу, — будзе каму чытаць. — Беда толькн, што нашы прагрэсиўные людзи трохи спяць и трохи баяцца нима ведама чаго.

У нас правяли шосу, але яна даходзиць толькн да границы Минскай губэрнии, а потым да станции Радашковичы Л. Р. Ж. Д. 3 вярсты трэба цягнуцца балотам. Минскае земства пастанавила выдаць на гэты кавалак 10 тысяч руб., а Виленски „Распарадзицельны Камитэт" — 8 тыс., але Минскае земства ўсё ешчэ не цае гэтых грошэй, хаця з Вильни ужо 3 разы да яго писали.

**Вецер.**

**Минск.** Праваслаўнае брацтво вельми стараецца паказаць, бытцам нашы беларуские мужыки не згаджаюцца, каб Дума дала свабоду шырыць усе рэлигии. Брацтва на мужыцких сходах угаварывае людзям рабиць прыгаворы проци пастанаўленьня Думскай камисии аб свабодзи навучаньня веры.—Здаецца нам, такие прыгаворы можэ рабиць тольки надта цёмны нарэд, бо ци-ж можна забараниць чалавеку выказваць свае думки аб рэлигии, аб тым, што ён личыць за справедливае, добрае? Для нас усе рэлигии роўные, и кали адну рэлигию будуць падтрымываць силай, а другую будуць циснуць, то гэта будзе несправедлива и саўсим не па хрысьцянску. **Минчук.**

М. **Мир** Минск. губ. Тут аштрафовали вучыцеля Семёна С-а за „незаконнае собраньне" на 50 руб. Уся „незаконнасць" была ў тым, што к гаспадыни, гдзе жыве С., прыходзили многа маладых людзей ў госьци, бо у яе ёсць дочка. Як палиция рабила обыск ў гэтай кватэры, дык С. не было дома. **Я. К.**

**Слуцк** Минск. губ. З жыдоўских грошэй, што збираюцца ў „каробочны сбор", часць жыды мусяць аддаваць на утрыманьне праваслаўнаго сабора. Вось жыды прасили, каб з их зняли гэту павиннасць, але просьба их ня споўнена, як пишэ „Рѣчь".

**Витэбск.** Ў тутэйшым „истинно-русским" саюзи аткрылися вяликие злодзейства. У тэлеграмах чытаем, што „саюз" ўзяў ад земства хлеб для прадажы мужыком за танную цэну, и вось пры гэтым шмат хлеба украдзена. Справа аб злодзействи пашла к пракурору, и на дабро прадседацеля „саюзникоў" Фролова налажыли „запрэшчэнне".

## ЛИСТ ДА РЭДАКЦИИ „НАШАЕ НИВЫ".

Уважаючы на нидастатак нашага краёвага письма и пракунаўшыся, што такое дужа патрэбна дзиля прасьветы Краю и Людцаў, и дзиля улаўчэння писання, — майим з Липня месица, сёлита, выдаваць зборники письма краёвага, найбольш творы нашых краёвых писароў. Дзиля таго запрашаим усих, хто да гэтага прылучыцца гатоў, прысылаць свае вытвары слова для зборникаў. Зборники маюць быць научныя—литарацкия—гисторычныя—статыстычныя. Усякия цэнныя для якой нибудзь карысьци вытвары будуць роўна прыдатны для зборникоў як писаныя рускими так и польскими литарами, ни ўважаючы на пракунання ни стан писароў. Дужа надарылосяб писання даўнейшыя, даўнейшых писароў, або цяперашних ды ўжо старых па веку. Просим прысылаць. Зборники выхадзиць будуць так часта, як на тоя сабярэцца вытвароў шмат, прымерам што чверць году, або што месяц, або и часьцей; формай вяликай чацьвёртки, страниц каля 100, цаной капеяк 50. Письмы, вытвары и грошы высылаць у **Рыгу, Мельничная вулица, дому № 125, кв. 6, В. Ластоускаму.**

Выдаўцы: **Э. Будзько.**
**В. Ластоуски.**

# З усих старон.

Ў **Пецербургу** на вяликдзень адбыўся зьезд „Вучыцельскай Фэдэрации" (саюза). Были тут дэпутаты ад национальных саюзоў вучыцелёў вели-

карусоў (руских), украинцоў, беларусоў, эстонцоў, жыдоў, татароў (крымских, казанских и каўказких), бурятоў и калмыкоў. Польские дэпутаты выбиралися так сама прыехаць, але их прад самым выездам арэштавали ў Варшави.

Зьезд найбольш займаўся справай аб нацыональнай школи (ў каторай вучыли-бы дзетак ў их роднай мови). Дэпутаты-вучыцели ад усих гэтых наций расказвали, як стаиць у их школьная справа, якое жыцьцё вядуць вучыцели, дый што робицца, каб завясьци вучэньне ў роднай мови.— Разбирали пытаньне, яких дабивацца парадкоў, каб пры их усе народы ў Расейским гасударстви мели свабоду для сваей национальнай культуры, для национальнаго адрадзэньня.

Дэпутат ад беларуских вучыцелёў гаварыў аб „Беларускім Учыцельскім Саюзи“ и аб яго рабоци. Як видаць з яго мовы, да гэтаго саюзу належыць покуль-што ня надта многа вучыцелёў, бо у нас на Беларуси вучыцели народные ўсё больш спяць дый ни аб чым думаць ня хочуць, и тольки невяликая грамада их (маладые) займаецца вельми важнай справай навучаньня беларусоў па-беларуску, як яны меж сабою гаворяць, як гаварыли ад векоў их бацьки и дзеды.

(М. К.)

Гор. **Бятка**. Судзебная Палата асудзила на 6 месяцоў ў турму тутэйшаго полицмэйстра Фёдорова, каторы дапусьциў ў гор. Вятцы пагром у акцябры 1905 г. Пры пагроми было забита 6 чал. и 40 зранена. „Рѣчь“.

**Пецербург.** З Унивэрсытэту выдалили тысячу двесьци студэнтоў, каторые ня мели чым заплациць за вучэньне.

**Киеу**. 6 мая ў мястэчку Смеле „саюзники“ зрабили працэсию з музыкай и з песьнями. Пасьля працэсии „саюзники“ насьцебалися гарэлки и пайшли биць жыдоў и ўсих, хто бараниў беззашчытных жыдоў ад дзиких зьверств.

Многа памешчыкоў просяць администрацию памагчы им ваеваць проци забастоўшчыкоў, бо тут чакаюць, што ў летку будзе шмат забастовак сельских рабочых. „Рѣчь“.

Ў в. **Кусонь** Новгородзкай губ. и павету 30 марца, як пишэ „Рѣчь“, наехаў прыстаў са стражниками ўзыскиваць з мужыкоў неякие грошы. Мужыки, спужаўшыся стражникоў, пакорне панясли грошы, што ад их выпадали, ў хату старасты, и тольки адзин с-памеж их – Фомин падаў грошы ураднику праз вакно з сваей хаты. Але-ж аказалозя, што заместа 1 р. 52 кап., як выпадала на яго, Фомин даў тольки 1 р. 50 кап., бо двух капеек мусиць не было у яго. Урадник сказаў аб гэтым прыставу. — Тады к хаци Фомина прыехаў ужо сам прыстав и прыказаў арэштаваць „праступника“. Стражники накинулися на яго и пачали немилясерне биць, чым папала Маци Фомина хацела бараниць сына, але-ж ёй стражник так ўдэрыў у скронь, што яна самлела и павалилася на зямлю, як нежывая. Фомина завяли у кватэру старасты.— Як мужыки пачули, бытцам маци Фомина забили, яны ўсей грамадой сабралися каля хаты старасты и стали дамагацца, каб арэштованаго выпусьцили, каб ён мог паехаць па сьвяшчэника ци па доктара. За гэта прыстаў прыказаў арэштаваць ешчэ нескольки мужыкоў за „бунт“, и их „администрациўным парадкам“ засадзили ў адседку на тры месяцы.

**Херсон**. 8-го мая тут павесили дванаццаць мужыкоў, каторых ваенны суд асудзиў на сьмерць за тое, што яны напали на маёнтак памешчыка Лубенко ў Елисаветградзким павеци. „Рѣчь“.

**З Пермскай губэрни, Верхотурскаго павету** (ў Сыбиры) пишуць ў газэту „Рѣчь“ вось што.

Цяжкая была гэтая зима для пераселенцоў, што прыехали ў гэты павет найбольш з Минскай и Магилеўскай губ.,—ўсяго их каля 20 тысяч чалевек. — Трава выросла дрэнная; сена падаражэла аж да 60 кап. за пуд. Прышлося купляць корм, а каб было за што, думали мужыки прадаць лес, што быў на ихней зямли. Але-ж тут як снег на галаву звалиўся цыркуляр: „пераселенцом дазволена рубиць лес тольки для сваей патрэбы, а не на продаж; вось усё тое дрэва, што будзе прыгатована для прадажы, мае быць сконфискована, а тады яго прададуць з лицытации и аддадуць грошы ў казну; пераселенцом не дадуць ни капейки“. Таким парадкам бедные людзи ня тольки не здалели дабыць патрэбных грошэй, але нават прапала их праца и дабро. — У некаторых пераселенцоў были ўжо дазваленьня прадаць лес. Дык жэ начальства написало други цыркуляр, каторы прызнаў, што тые дазваленьня силы ня маюць и адменяюцца .. Так начальства „памагло“ пераселенцом выйсьци з бяды.

Пасьля ўсяго гэтаго ня тольки пачала дохнуць скацина, а стали галадаць самы пераселенцы. И вось, каб не глядзець, як дзеци будуць умираць ад голаду, адзин мужык вывёз за вёску и пакинуў трое дзетак сваих; тые ўсе трое замёрзли, бо гэта было зараз пасля Каляд.

Ци ня прымуць пад увагу дэпутаты ад Пермскай губэрни ўсю гэту справу и ци не пастараюцца памагчы нешчасным нашым пераселенцом?

---

## З АМЭРЫКИ.

Нашы амэрыканские корэспондэнты ўжо не раз писали, што у Амэрыцэ для працоўнаго народу настали дрэнные часы. Як пачаўся „кризис“, банкруцтва, — шмат фабрык и заводоў пазакрывалося, и вельми многа людзей асталося без працы и без хлеба. Цяпер,—як пишэ „Слово“—„у Злучэных Штатах (Амэрыцэ Поўночнай) ня маюць заробку аж чатыры мильёны семсот пяцьдзесят тысяч работнікоў! И гэткае лиха робицца ў гасударстви, куды з усих краёў збегалися галодные, абарваные людзи, гдзе яны заўсягды мели работу и мели з чаго пражыць, хаця амэрыканские капиталисты (багачы) выцягвали з их усе соки“. Хоць у Амэрыцэ ўсё правицельства выбарнае, але-ж рабочы народ не трымаўся разам на выбарах, а як ешчэ капиталисты добра пастарались, то и павыбирали таких правицелёў, што цягнуць за багатых. Вось жэ цяпер тое правицельства ня тольки не памагло безработным, а „выдало новые законы, каторые саўсим адабрали ад работнікоў их правы, дабытые доўгим змаганьнем з капиталистами. Изноў жэ найвысшы Суд Амэрыканских Злучэных Штатоў (як у нас Сэнат) нядаўно даў фабрыкантом права выганяць са службы рабочых, што належаць да профэссиональных саюзоў. Закон аб тым, каб фабрыканты плацили рабочым за ўсе шкоды, якие им зробяцца пры рабоци, правицельства скасавало“. . . . . „Па многих гарадох безработные рабили дэмонстрации, каторые дзе-не-дзе скончылись битваю з палицией. Дзе-недзе безработные пачали забиваць капиталистоў. Але з гэтаго ниякой карысьци ня будзе, хиба тольки шкода: рабочы народ можэ дабиціца палепшэньня свайго жыцьця иншыми способами, и дзеля гэтаго патрэбны рабочые „организации“. У Амэрыцэ ёсць „федэрация (саюз) працы“, да

каторай належыць вельми многа рабочых, што пазлучалися ў прафэссиональные саюзы. Цяпер гэтая „фэдэрация“ прылучылася да социалистычнай партии. Да социалистоў належыць близка паўтары мильёна людзей, и яны на новых выбарох хочуць выбраць на „прэзыдэнта“ свайго социалистычнаго кандыдата“. („Слово“).

Покуль што ешчэ будзе, у Амэрыку нашым беларусом цяпер ехаць не варта. Лепей пачакаць лепшых часоў у сваёй хаци. Беда, што ад нас пачали людзи выбирацца туды акурат ў тым часи, як пачаўся „кризис“.

* * *

*(Перэклад з польскаго—М. Конопницкай).*

Мой Божэ милы, Твая воля
Была убраць луги и поле
Такими пекными цьветами,
Гдзе лиўся пот наш са сьлязами.
На што-ж яны, к чаму их многа,
Кали жыцьцё цяжэй астрога?!..
У вечнай працы твае людзи
Рвуць для кавалка хлеба грудзи;
Нашто-ж нам птушка так сьпевае,
Кали нас радасць абминае?—
Апроч бяды и злой напасьци
Другога мы ня бачым шчасьця!
Ня песьня—стогн чуваць у поли, —
К чаму-ж нам сонца сьвет ў нядоли?
Што красата зимы и лета —
Ад смутку не пазбавиць гэта.
Шмат ёсць людзей—ня маюць хлеба,
Што-ж им прастор без краю неба?
Што бляск зары чырвонай зранку,
Пах канюшыны, ци румянку?
Ни лес, ни сенажаць, ни паша
Ў нудзе ня цешаць сэрцэ нашэ;
Што вечар цихи, ясны зорки,
Кали жывецца цяжка й горка?!...

**Альбэрт Пав—ич.**

## РАДА ДЛЯ ГАСПАДАРОЎ.

Каб куры добра нясьлися, а мала каштавали, М. К. ў „Z. Wil.“ радзиць кармиць их гэтак.

На дзесяць кур трэба даваць *зимою*

*1) раницай и у палудзень:*

2 фунты бульбы гатаванай; 1 ф. атрубоў пшаничных; 4 лыжки муки з касьцей змеленых або скарупы ад 4 яек, дробна пабитые; $^1/_2$ кварты зьбиранаго малака ци 4 лоты абрэзкоў ад мяса;

ўсё, добра зьмешаўшы, даюць курам цёплае ў чыстым карытку, дадаўшы плеў ад канюшыны ци сэрадэли.

*2) у вечар:*

2 фунты зерня—аўса, ячменю, пшанишы ци кукурузы.

Апроч гэтаго ў дзень даваць адзин сьвежы бурак, разрэзаны па-палови, або крыху лисьцёў капусьцяных.

*У летку*, кали куры ходзяць свабодне па гародчыку ци ў поли, доси даць вечарам 1 фунт зерня. Кали-ж трымаюць их ў катуху замкненых, то трэба даваць тое-ж, што зимою.

Кали будзем гэтаким спосабам кармиць куры, то на дзесяць штук праз год выйдзе

| | | |
|---|---|---|
| бульбы на . . . . | 1 руб. | — к. |
| $4^1/_2$ пуда атрубоў па 90 к. | 4 руб. | 35 к. |
| 90 кварт малака . . | 1 руб. | 35 к. |
| зерня на . . . . | 6 руб. | — к. |
| буракоў ци лисьцёў капусьцяных на . . . | | 30 к. |
| Усяго разам на | 13 руб. | — к. |

## ПАЧТОВАЯ СКРЫНКА.

м. **Рукойни** Вилен. губ. и павету **И. Шчырам**у:... ад чаго, хто мае многа зямли, таму добра жывецца, а мужыку на аблизанай дзесяцинцы трэба абливацца потам и слязми, и з бяды ён ня можэ вылезци... што даўней ў нас шляхта мела уси правы, а мужык меў тольки права цярпець и працаваць, не заўсягды на сябе самаго...“—ўсё гэта пишыце вы праўду!... у газэтах, вы кажэце, пишуць усе: „працуй мужычок, бо праца ўсё твае шчасьце...“ Згаджаемся з вами, што и сам мудры Саламон, кали яго пасадзиць замест мужыка, не патрапиў бы збагацець;—апроч працы, трэба каб было добрае устройство жыцця, добрые парадки и свабода арганизавацца и працаваць для грамадзких спраў.

**Минск Дзеду Дзенису:** даўно вы не писали ничога; надрукуем!

**Минск.** А. Ф. П. На рысунку мужык вышаў заграничны, а рэшта ўсё добра.

Ст. **Рудзенск** А. Г. — агентуру можэм даць, каб прадаваць „Н. Н.“, а не дарма.

М. **Романово Верабью:** Вы злуеце, што газэта „Крестьянинъ“ перадрукавала з „Нашае Нивы“ апаведаньне „Злые нявестки и хитры дзед“, зрабиўшы з арганистаго—псаломшчыка, а дзеда перавярнуўшы ў праваслаўнаго.—Мы ничога ня маем проци гэтаго. Добра ешчэ, што «Крестьянинъ» не записаў дзеда ў „Окраинны Саюз“!

**Рыга Грынцу:** аб гаспадарцы пишыце ешчэ, тольки практыку. Разам скарыстаем.

**Минск, Аннополь Селянцу:** хто винаваты, што цыганки лечаць ад хваробы—тольки глупства людзей! Книжки высылаем. Вышлице марками па 2 и 7 кап. (пачтовыми).

# АБЪЯУЛЕННЯ

## Суполка

### „Загляне сонцэ и у нашэ ваконцэ“

**выдала покуль што и прадае:**

**Biełaruski lementar** abo pieršaja nawuka čytańnia, cena 6 kapiejek.

**Pieršaje čytańnie dla dzietak** biełarusaŭ. Napisała Ciotka, cena 6 kap.

**Беларуски лемэнтар,** або першая навука чытаньня, цэна 6 кап.

**Першае чытаньне для дзетак** беларусаў; злажыла Цётка, цэна 6 кап.

**Гутарки аб неби и зямли,** цэна 15 кап.

**Dudka Biełaruskaja,** Macieja Buračka, cena 25 kap.

**Dudka Biełaruskaja,** pieknaje wydannie, cena 50 k.

**Pan Tadeuš.** Pa polsku napisaŭ Adam Mickiewič na biełaruskuju hutarku pierewiarnuŭ Wincuk Marcinkiewič, cena 25 kap.

**Pan Tadeuš.** Pieknaje wydańnie, cena 50 kap.

**Hapon.** Apowieść biełaruskaja Wincuka Marcinkiewiča, cena 15 kap.

**Hapon** Pieknaje wydańnie, cena 30 kap.

**„Жалейка“** Янука Купалы, цэна 50 кап.

*Узяла на склад и прадае:*

**Вязанка.** Янки Лучыны (Ивана Неслухоўскаго) цэна 4 кап.

**Казки.** Выдаў А. К. цэна 6 кап.

**Ziamielnaja sprawa u Nowaj Zelandyi,** cena 3 kap.

**Зямельная справа у Новай Зэляндыи,** цэна 3 кап.

**Gedali,** apawiedannie Ożeškowaj, cena 6 kap.

**Гэдали,** апаведанне Ожэшковай, цэна 6 кап.

**Kazka ab wadzie,** Bellami, cena 3 kap.

**Казка аб вадзе,** Бэльлями, цэна 3 кап.

**Karotki katechizm,** cena 5 kap.

**„На пиресяленьня“.** Разсказъ тётки Домны изъ Полѣсья. М. Н. Косичъ, ц. 10 кап.

**Переложеніе** нѣкоторыхъ басенъ Крылова на бѣлорускоe нарѣчіе. М. Н. Косичъ. Ц. 15 кап.

**Cukier.** Z hutarak z dziadźkam Symonam, napisaŭ Waciuk Trojca, cena 3 kap.

**Цукер.** З гутарак з дзядзькам Сымонам, написаў Вацюк Тройца, цэна 3 кап.

**Čečot.** Pieśni wieśniače z nad Niemna i Dźwiny (100 biełaruskich pieśniaŭ). Cena. 50 kap.

Словарь бѣлорусскаго нарѣчья Носовича ц. 3 руб.

Очеркъ звуковъ и формъ бѣлорусской рѣчи. Е. Карскаго, ц. 1 руб. 25 кап.

Программа для собиранія особенностей бѣлорусской рѣчи. Е. Карскаго стр. 59, ц. 25 кап.

Государственное хозяйство великаго княжества Литовскаго стр. 807—CXII. Довнаръ-Запольскаго, цена 4 руб.

Очерки по организаціи Западно-русскаго крестьянства въ XVI в. Довнаръ Запольскаго стр. 307—167, цэна 3 руб. 50 кап.

В. Дунинъ.—Марцинкевичъ и его поэма Гапонъ. М. Довнаръ-Запольскій, ц. 20 коп.

В. Дунинъ.—Марцинкевичъ и его поэма „Тарасъ на Парнасѣ“. М. Довнаръ-Запольскаго, ц. 15 к.

Западно-русскіе переводы, псалтыря въ XV—XVIII вѣкахъ; изслѣдованіе Е. Ѳ. Карскаго, стр. 444 цена 3 руб.

Документы Московскаго Архива Министерства Юстиціи (найбольш беларуские) стр. 570 цена 3 руб.

*Беларуские пачтовые писулькі:*

Шчорсуны у летку, Шчорсуны у зимку; Пранцишэк Богушэвич (Мацей Бурачок) песьняр беларуски; Винцук Марцинкевич—песьняр беларуски; Мужыки с-над Пухавич; Торжышчэ у Пуховичах; Дзеўчата с-пад Слуцка; Парабкава дворная хата; Дудар беларуски; Янка Лучына (Иван Неслухоўски), песьняр беларуски; Вясковая баба с Трыбужкоў; Дом Тадэуша Косьцюшки у Мэрэчоўшчыни, цэна кожнае писульки 5 капеек.

Усё гэта можна купляць у глаўным складзи у Пецербургу, Василёў востроў, 4 линия, № 45 кв. 16.

Хто купляе у глаўным складзи ня менш як за поўрубель, той ня плаціць за праслаиьне почтаю. Малые грошы можна высылаць пачтовыми марками. Яшчэ можна усё гэта купляць:

у **Вильни** у книгарнях В. Макоўскага, И. Завадзкаго, М. Пясэцкае-Шлапэлис, у книгарни „Летува“, Карбасникова и у рэдакции беларускае газэты „Наша Нива“, Виленская вул. № 20.

у **Менску** у книгарни В. Макоўскага и Фрэнкеля.

**Витэбску** „ Коловрат-Чэрвинскай.

**Гродни** „ Б. Козлоўскага.

**Могилеви** „ И. Г. Сыркина.

**Гомли** „ И. Г. Сыркина.

**Пецярбургу** ў польскай книгарни на Екатерынинскай вулицы.

**Варшави** ў книгарни Г. Цэнтэршвэра на Маршалкоўскай вулицы.

**Слоними**—Книгарня Польска.

Скора выйдзе „Snyk Biełaruski“.

Рэдактор-Выдаўца А. Ўласоў.

Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.